КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# Пратакол узаемадзеяння паміж Нацыянальнай лідаркай Святланай Ціханоўскай, Каардынацыйнай радай Беларусі, Аб'яднаным пераходным кабінетам Беларусі і Офісам Святланы Ціханоўскай

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

Зыходзячы з таго, што Нацыянальная лідарка Святлана Ціханоўская, Каардынацыйная рада Беларусі (КР), Аб'яднаны пераходны кабінет Беларусі (АПК) і Офіс Святланы Ціханоўскай (ОСЦ) з'яўляюцца ключавымі палітычнымі інстытутамі беларускага дэмакратычнага руху, кожны з якіх адыгрывае сваю ўнікальную ролю ў барацьбе за дэмакратычныя змены ў краіне (далей – Бакі),

пацвярджаючы, што стратэгічнай мэтай усіх Бакоў з'яўляецца захаванне незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і забеспячэнне пераходу да дэмакратычнай формы кіравання ў краіне,

кіруючыся мэтай размеркаваць паўнамоцтвы і функцыі паміж Бакамі, а таксама вызначыць абавязковыя да выканання агульныя правілы і працэдуры іх узаемадзеяння,

адзначаючы неабходнасць прыняць механізмы і працэдуры вырашэння магчымых рознагалоссяў Бакоў,

***Бакі заключылі гэты Пратакол узаемадзеяння.***

## 1. Азначэнні

1.1. ***Нацыянальная лідарка Святлана Ціханоўская*** – пераможца прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, якая атрымала давер народа Беларусі прадстаўляць і абараняць яго інтарэсы, ажыццяўляць лідзіруючую ролю ў арганізацыі сумеснай дзейнасці дэмакратычных сіл.

1.2. ***Каардынацыйная рада Беларусі*** – калектыўны прадстаўнічы орган дэмакратычнай часткі беларускага грамадства, які каардынуе ўзаемадзеянне дэмакратычных сіл на ўзроўні выпрацоўкі і (або) узгаднення стратэгічных рашэнняў.

1.3. ***Аб'яднаны пераходны кабінет Беларусі*** – калегіяльны выканаўчы орган, які каардынуе дзейнасць дэмакратычных сіл Беларусі па рэалізацыі рашэнняў, стратэгій і палітык па напрамках, вызначаных рэгламентам АПК.

1.4. ***Офіс Святланы Ціханоўскай*** – арганізацыя, якая забяспечвае дзейнасць Нацыянальнай лідаркі.

1.5. ***Дэмакратычныя сілы Беларусі*** – сукупнасць палітычных і грамадскіх арганізацый, рухаў, ініцыятыў і актывістаў, якія выступаюць за ўсталяванне і развіццё дэмакратычнай сістэмы кіравання ў Рэспубліцы Беларусь і якія аб'ядноўваюцца на аснове агульных каштоўнасцяў і мэт, такіх як абарона правоў і свабод чалавека, вяршэнства права, правядзенне сумленных і свабодных выбараў, а таксама супрацьдзеянне аўтарытарызму і рэпрэсіям.

## 2. Асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння Бакоў

2.1. Прынцып роўнасці: кожны з Бакоў прызнае і паважае ўклад іншых у агульную справу, падтрымліваючы атмасферу ўзаемнай павагі.

2.2. Прынцып узгодненасці дзеянняў: Бакі забяспечваюць каардынацыю і ўзгодненасць іх дзеянняў, накіраваных на дасягненне агульнай стратэгічнай мэты.

2.3. Прынцып кансэнсусу: Бакі імкнуцца да дасягнення агульнай згоды пры прыняцці стратэгічна значных рашэнняў.

2.4. Прынцып канструктыўнага вырашэння рознагалоссяў: Бакі абавязваюцца прыкладаць усе неабходныя намаганні для вырашэння магчымых рознагалоссяў праз дыялог і пошук кампрамісаў, не дапускаючы эскалацыі праблем.

2.5. Прынцып празрыстасці і ўзаемнага інфармавання: Бакі рэгулярна рыхтуюць публічныя справаздачы аб сваёй дзейнасці, а таксама імкнуцца своечасова і дакладна інфармаваць адно аднаго аб сваіх планах і ініцыятывах, выкарыстоўваючы бяспечныя метады абмену інфармацыяй.

## 3. Сферы кампетэнцыі Бакоў

***3.1. Каардынацыйная рада Беларусі:***
3.1.1 ініцыяванне, распрацоўка і зацвярджэнне палітык і стратэгій, накіраваных на дасягненне дэмакратычных змен у краіне;

3.1.2. абмеркаванне грамадска значных пытанняў, у тым ліку арганізацыя і правядзенне публічных слуханняў;

3.1.3. абмеркаванне і абагульненне розных прапаноў па рэформах, накіраваных на пабудову ў Беларусі прававой дэмакратычнай дзяржавы;

3.1.4. ажыццяўленне грамадзянскага кантролю за дзейнасцю інстытутаў дэмакратычных сіл шляхам маніторынгу і аналізу вынікаў іх дзейнасці, а таксама заслухоўвання публічных справаздач аб выкананні іх функцый;

3.1.5. удзел у міжнародным міжпарламенцкім супрацоўніцтве.

***3.2. Аб'яднаны пераходны кабінет Беларусі:***
3.2.1. ініцыяванне, распрацоўка і зацвярджэнне палітык і стратэгій, накіраваных на дасягненне дэмакратычных змен у краіне;

3.2.2. прыняцце рашэнняў па рэалізацыі палітык і стратэгій дэмакратычных сіл, распрацоўка і забеспячэнне выканання канкрэтных праграм і праектаў па напрамках, вызначаных рэгламентам АПК; забеспячэнне каардынацыі дзейнасці дэмакратычных сіл Беларусі для гэтых мэт;

3.2.2. прыняцце рашэнняў па рэалізацыі палітык і стратэгій дэмакратычных сіл, распрацоўка і забеспячэнне выканання канкрэтных праграм і праектаў па напрамках, вызначаных рэгламентам АПК; забеспячэнне каардынацыі дзейнасці дэмакратычных сіл Беларусі для гэтых мэт;

3.2.3. правядзенне кансультацый з міжнароднымі партнёрамі па мабілізацыі падтрымкі дэмакратычных сіл, а таксама гуманітарнай дапамогі беларусам, якія маюць у гэтым патрэбу.

*3.3. Офіс Святланы Ціханоўскай:*
3.3.1. ініцыяванне, распрацоўка і зацвярджэнне палітык і стратэгій, накіраваных на дасягненне дэмакратычных змен у краіне;

3.3.2. прадастаўленне прававой, кансультатыўнай, інфармацыйнай, экспертна-аналітычнай, кадравай і іншай падтрымкі дзейнасці Нацыянальнай лідаркі, накіраванай на абарону правоў і інтарэсаў беларусаў, а таксама на прадстаўленне нацыянальных інтарэсаў Беларусі на міжнароднай арэне;

3.3.3 забеспячэнне ўзаемадзеяння Нацыянальнай лідаркі з КР, АПК, палітычнымі партыямі, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і грамадзянамі ў мэтах аб'яднання і матывавання беларусаў на дасягненне агульнай стратэгічнай мэты дэмакратычных сіл;

3.3.4. інфармацыйна-камунікацыйная дзейнасць, накіраваная на інфармаванне беларусаў і міжнароднай супольнасці пра дзейнасць Нацыянальнай лідаркі, прасоўванне мэт дэмакратычнага руху і мабілізацыю яго падтрымкі.

## 4. Парадак фарміравання Бакоў

4.1. Святлана Ціханоўская перамагла на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года і выконвае ролю Нацыянальнай лідаркі да правядзення сумленных і свабодных выбараў у Беларусі альбо да ўласнага рашэння спыніць сваю дзейнасць у якасці Нацыянальнай лідаркі.

4.2. КР фармуецца на аснове дэмакратычных выбараў з выкарыстаннем прапарцыйнай выбарчай сістэмы. Выбары ў КР праводзяцца не радзей, чым 1 раз у два гады.

4.3. Члены АПК прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады Нацыянальнай лідаркай з улікам рэкамендацый КР, якая прадстаўляе сваю пазіцыю аб прызначэнні ў тэрмін да 15 дзён ад паступлення запыту. КР можа прапанаваць Нацыянальнай лідарцы кандыдатуры на пасады прадстаўнікоў АПК, якія, на думку КР, валодаюць адпаведнымі кампетэнцыямі і якасцямі, а таксама рэкамендацыі аб неадпаведнасці прадстаўнікоў АПК займанай пасадзе. Нацыянальная лідарка прымае

рашэнне аб прапанаваных КР кандыдатурах і рэкамендацыях аб неадпаведнасці прадстаўнікоў АПК займанай пасадзе не пазней за 15 дзён пасля паступлення прапановы.

4.4. Офіс Святланы Ціханоўскай заснаваны Нацыянальнай лідаркай, і яго супрацоўнікі набіраюцца на падставе ўнутраных працэдур.

## 5. Працэдура распрацоўкі агульных палітык і стратэгій

5.1. Любы з Бакоў можа ініцыяваць працэс распрацоўкі агульнай палітыкі або стратэгіі дэмакратычных сіл па канкрэтным напрамку або пытанні, накіраваўшы іншым Бакам прапанову са сваім абгрунтаваннем.

5.2. Кожны Бок на працягу 5 працоўных дзён накіроўвае адказ на прапанову аб распрацоўцы агульнай палітыкі або стратэгіі і, у выпадку станоўчай рэакцыі, прапануе кандыдатуру/ры сваіх упаўнаважаных прадстаўнікоў для абмеркавання дадзенага пытання.

5.3. Для ўсебаковага і комплекснага абмеркавання пастаўленай задачы з зацікаўленых прадстаўнікоў Бакоў ствараецца ўпаўнаважаная працоўная група (УПГ). УПГ лічыцца створанай, калі кожны Бок накіраваў у яе склад як мінімум аднаго свайго прадстаўніка. Праца УПГ арганізоўваецца на аснове ўласнага рэгламенту, які вызначае правілы працэдуры, тэрміны і парадак прыняцця рашэнняў. Пры неабходнасці ў рабоце УПГ могуць удзельнічаць эксперты і прадстаўнікі іншых арганізацый і ініцыятыў па запрашэнні УПГ.

5.4. УПГ распрацоўвае праект палітыкі або стратэгіі, які накіроўваецца Бакам на ўзгадненне ў двух чытаннях.

5.5. У першым чытанні кожны з Бакоў на працягу 15 дзён дае адказ, ці прымаецца праект за аснову, і дае свае заўвагі, змяненні і дапаўненні да праекта.

5.6. Праект лічыцца прынятым у першым чытанні за аснову, калі за гэта выказаліся ўсе Бакі. УПГ дапрацоўвае праект з улікам заўваг і прапаноў, што паступілі, і накіроўвае яго Бакам на зацвярджэнне.

5.7. У другім чытанні кожны з Бакоў на працягу 10 дзён зацвярджае дапрацаваны праект у цэлым. На гэтым этапе ўнясенне змен у тэкст праекту не дапускаецца.

5.8. Калі ў другім чытанні КР або АПК не ўзгадняюць праект дакумента, то УПГ, якая распрацавала яго, распускаецца. Зацікаўлены Бок можа паўторна ініцыяваць працэс распрацоўкі палітыкі ці стратэгіі.

5.9. Дакумент аб агульнай палітыцы ці стратэгіі дэмакратычных сіл лічыцца прынятым, калі ён зацверджаны без зменаў КР, АПК і падпісаны

Нацыянальнай лідаркай.

5.10. Зацверджаны дакумент аб агульнай палітыцы або стратэгіі дэмакратычных сіл накіроўваецца Сакратарыятам АПК зацікаўленым выканаўцам для кіраўніцтва ў працы, а таксама публікуецца ў якасці рэкамендаваных агульных палітык і/або стратэгій дэмакратычных сіл.

5.11. Ход рэалізацыі зацверджаных палітык і стратэгій, дзеянні адказных выканаўцаў і сувыканаўцаў з'яўляюцца прадметам маніторынгу і аналізу ўсіх Бакоў, якія могуць уносіць прапановы для павышэння эфектыўнасці рашэнняў, прынятых у выкананне агульных палітык і стратэгій.

5.12. У мэтах выканання зацверджаных палітык і стратэгій Бакі самастойна прымаюць неабходныя для рэалізацыі рашэнні, забяспечваючы адпаведнасць мэтам і задачам агульных дакументаў, а таксама неабходны ўзровень каардынацыі імплементацыйных планаў, праграм і праектаў.

5.13. Карэкціроўка або дапаўненне ў агульную палітыку або стратэгію ўносяцца ў адпаведнасці з працэдурай дадзенага раздзела.

## 6. Абмен інфармацыяй, забеспячэнне каардынацыі дзеянняў і справаздачнасць

6.1. У мэтах забеспячэння эфектыўнага ўзаемадзеяння Бакі вызначаюць у сваіх структурах кантактных асоб, якія на пастаяннай аснове ажыццяўляюць абмен інфармацыяй аб бягучай дзейнасці, узгадняюць планы і фарматы сумесных мерапрыемстваў, а таксама вырашаюць іншыя пытанні, якія датычацца каардынацыі дзеянняў.

6.2. Бакі вызначаюць абавязковыя правілы бяспечнага абмену інфармацыяй для выключэння ўцечак даных або несанкцыянаванага доступу да іх.

6.3. Бакі штогод рыхтуюць публічныя гадавыя справаздачы аб сваёй дзейнасці.

6.4. Кожны з Бакоў мае права накіраваць запыт па растлумачэнні і/або трактоўцы рашэнняў іншаму Боку, які абавязаны прадаставіць свой аргументаваны адказ на працягу 7 дзён.

6.5. Любы з Бакоў можа заявіць аб праблеме дубліравання функцый, якая патрабуе каардынацыі.

6.6. Для разгляду такіх заяў Бакі засноўваюць спецыяльную камісію і дэлегуюць у яе склад па адным прадстаўніку (з улікам сферы дзейнасці). Камісія праводзіць аналіз рашэнняў і дзеянняў, у выніку якіх узнікае пытанне аб дубліраванні функцый, і выпрацоўвае адпаведныя

рэкамендацыі.

6.7. Рэкамендацыі Камісіі неадкладна разглядаюцца кіруючымі органамі зацікаўленых Бакоў з мэтай прыняцця рашэнняў, якія выключаюць або мінімізуюць дубліраванне і павышаюць каардынацыю і эфектыўнасць дзеянняў.

6.8. Штогод АПК прадстаўляе на пленарным пасяджэнні КР інфармацыю (справаздачу) аб дзейнасці і стратэгічных прыярытэтах АПК і адказвае на пытанні членаў КР.

**7. Працэдура вырашэння рознагалоссяў**

7.1. Любы з Бакоў можа дэкляраваць наяўнасць рознагалоссяў, звязаных з выкананнем палажэнняў гэтага Пратакола або з рызыкамі рэпутацыйнага ўрону для дэмакратычных сіл, з указаннем магчымых прычын спрэчак і іх наступстваў.

7.2. Бакі Пратакола імкнуцца да вырашэння рознагалоссяў, якія ўзнікаюць, праз канструктыўны дыялог і ўнутраныя механізмы ўрэгулявання.

7.3. Пры немагчымасці дасягнуць згоды на працягу 30 дзён Бакі перадаюць спрэчку на разгляд Нацыянальнай лідарцы, якая выносіць канчатковае рашэнне, якое адпавядае нацыянальным інтарэсам, і пацвярджаюць сваю гатоўнасць яго выканаць.

**8. Заключныя палажэнні**

8.1. Палажэнні гэтага Пратакола могуць быць зменены або дапоўнены па ўзаемнай згодзе ўсіх Бакоў, выражанай у пісьмовай форме.

8.2. Калі палажэнні гэтага Пратакола ўступаюць у супярэчнасць з палажэннямі іншых дакументаў Бакоў, то пры іх прымяненні і/або тлумачэнні пераважную сілу маюць палажэнні гэтага Пратакола.

8.3. Гэты Пратакол лічыцца прынятым, калі ён зацверджаны без змен КР, АПК, ОСЦ і падпісаны Нацыянальнай лідаркай.

8.4. Гэты Пратакол уступае ў сілу ў дзень яго падпісання.

Нацыянальная лідарка Святлана Ціханоўская